Андрэй Мікалаевіч Мукавозчык

З Вікіпедыі, свабоднай энцыклапедыі

Андрэ́й Мікала́евіч Мукаво́зчык (нар. 1963, Новасібірск, Новасібірская вобласць, РСФСР) — беларускі калумніст, прапагандыст рэжыму Лукашэнкі.

Андрэй Мікалаевіч Мукавозчык	
Род дзейнасці	калумніст
Дата нараджэння	1963
Месца нараджэння	Новасібірск, Новасібірская вобласць, РСФСР, СССР
Месца працы	Інстытут цепла- і масаабмену імя А. В. Лыкава СБ. Беларусь сегодня
Альма-матар	фізічны факультэт БДУ
Узнагароды і прэміі	Залатая Ліцера (2020) Залатое пяро[d] (2020)

Біяграфія

Нарадзіўся ў 1963 годзе ў Новасібірску[1]. Вучыўся ў 95-й сярэдняй школе г. Мінска[2]. Скончыў фізфак БДУ[1]. Пасля ўніверсітэта тры гады па размеркаванні працаваў у Інстытуце цепла- і масаабмену імя А. В. Лыкава НАН Беларусі. Пачынаў пісаць кандыдацкую, але звязаў далейшае жыццё з КВЗ[2].

З 1988 г. удзельнічаў у «Клубе вясёлых і знаходлівых» (КВЗ)[3]. Узначальваў беларускае аб'яднанне КВЗ, быў вядоўцам перадач КВЗ на Беларускім тэлебачанні[4]. З яго дзейнасцю быў звязаны канфлікт паміж беларускім КВЗ і расійскімі праваўладальнікамі[5][6]. Стварыў і вёў гумарыстычнае тэлешоў «Вот так шоу» на БТ[7].

Пасля 2010 г. стаў вядомым як аглядальнік «Советская Белоруссия».

Жанаты[3].

Крытыка

Наша Ніва называе Мукавозчыка «адным з апошніх рэліктаў дзяржаўнай прапаганды ўзору канца 1990—2000-х», калі ў СМІ выступалі з прамовамі-пропаведзямі[8]. Абвінавачваўся ў тым, што ў сваіх публікацыях дазваляў сабе ў агрэсіўнай і прымітыўнай форме абразы і прыніжэнне апанентаў А. Лукашэнкі, здзекі з беларускай мовы і беларусаў, мізагіністычныя выказванні[9][10][11][12] і антысеміцкія намёкі[13].

У 2017 годзе актывіст Мікалай Дзядок падаў у суд на газету «Советская Белоруссия», патрабуючы абароны гонару і годнасці, а таксама кампенсацыі маральнай шкоды за выказванні, якія змяшчаліся ў артыкуле аўтарства Мукавозчыка[14].

У ліпені 2020 г. Марыя Калеснікава падала ў Генеральную пракуратуру, Міністэрства інфармацыі, Цэнтральную выбарчую камісію Беларусі, а таксама ў рэдакцыю газеты «Советская Белоруссия» заяву датычна публікацый А. Мукавозчыка, абвінавачваючы яго ў распальванні сацыяльнай і палітычнай розні, ілжывых абвінавачаннях, недапушчальных выказваннях і паклёпе ў дачыненні да праціўнікаў А. Лукашэнкі. Паводле Калеснікавай, Мукавозчык у сваіх публікацыях парушыў артыкулы 191, 188 і 189 Крымінальнага кодэксу Рэспублікі Беларусь[15].

У лістападзе 2020 года дацэнт кафедры медыялогіі журфака БДУ Інга Воюш правяла лінгвістычную экспертызу 200 тэкстаў Мукавозчыка з яго аўтарскай калонкі «Накіпела» ў СБ за летні перыяд таго года, у якіх ён аналізаваў выбарчую кампанію, і даказала, што яго тэксты ўяўляюць сабой прапаганду. Адным з інструментаў, якім актыўна карыстаецца аўтар, стала так званая мова варажнечы, ці рыторыка нянавісці (*убогія, звар'яцелыя пацукі, здыхлятнікі, зграя інтэлектуальных бамжоў, клоўны навапаказанай рады* і да т.п.)[16]. У ліпені 2022 года палітолаг Вольф Рубінчык звярнуў увагу, што ў кнізе А. Мукавозчыка «Революция мокрых штанов» (Мінск, 2021) сфальсіфікаваны цытаты з Уладзіміра Ляхоўскага і Ганны Севярынец; паводле ацэнкі Рубінчыка, кніга, вылучаная на атрыманне Нацыянальнай літаратурнай прэміі, мае для культуры не нулявую, а адмоўную вартасць[17].

У 2021 годзе А. Мукавозчыка абвінавацілі ў публікацыі пагроз фізічнай расправы над палітычнымі ўцекачамі і актывістамі Мікалаем Халезіным і Наталляй Калядой[18].

У красавіку 2023 года Мукавозчык заклікаў у эфіры тэлеканала СТБ публічна расстрэльваць беларусаў за публікацыю або перадачу фота і відэа расійскай вайсковай тэхнікі, якая перамяшчаецца па Беларусі. Таксама заяўляў, што трэба працягваць рэпрэсіі супраць беларусаў з уласнымі поглядамі на палітычную сітуацыю ў краіне[19].

Узнагароды

Узнагароджаны медалём «За працоўныя заслугі» (11 студзеня 2021)[20], лаўрэат XVI Нацыянальнага конкурсу «Залатая Літара» ў намінацыі «Найлепшы аналітычны матэрыял (журналісцкае расследаванне, праблемны артыкул, аўтарская калонка, рэцэнзія) рэспубліканскіх, абласных, раённых, гарадскіх, карпаратыўных друкаваных СМІ, інфармацыйных агенцтваў, сеткавых выданняў» (2020)[21], Рэспубліканскага творчага конкурсу «Залатое пяро-2020» у намінацыі «Найлепшы аўтарскі праект у інтэрнэце і сацыяльных сетках» (2020)[22].

Санкцыі ЕС і іншых краін

Мукавозчык быў суб'ектам забароны на паездкі і замарожвання актываў Еўрапейскім Саюзам паводле спісу беларускіх чыноўнікаў, адказных за палітычныя рэпрэсіі, падтасоўку вынікаў галасавання і прапаганду[23]. Згодна з рашэннем Еўрапейскага савета ад 21 чэрвеня 2021 года, адзін з асноўных прапагандыстаў рэжыму Лукашэнкі, які друкуецца ў газеце «СБ. Беларусь сегодня», у сваіх артыкулах сістэматычна негатыўна і зневажальна, выкарыстоўваючы падробленую інфармацыю, піша пра дэмакратычную апазіцыю і грамадзянскую супольнасць, з'яўляецца адной з асноўных крыніц прапаганды ў Беларусі, а атрыманыя ўзнагароды («Залатое пяро», «Залатая літара», «За працоўныя заслугі») сведчаць пра

падтрымку рэжыму Лукашэнкі і атрыманне выгады ад яго[24]. З той жа фармулёўкай 7 ліпеня 2021 года Мукавозчык трапіў і ў санкцыйны спіс Швейцарыі[25][26]. 6 ліпеня да чэрвеньскага пакета санкцый ЕС далучыліся Албанія, Ісландыя, Ліхтэнштэйн, Нарвегія, Паўночная Македонія, Чарнагорыя[27]. 2 снежня Мукавозчык быў даданы і ў санкцыйны спіс Вялікабрытаніі[28].

Зноскі

1. Андрей МУКОВОЗЧИК (https://www.sb.by/author/894796-andrey-mukovozchik/)
2. Андрэй МУКАВОЗЧЫК: "Я стараўся не быць «батанікам». 29.10.2016 (https://nastgaz.by/andrey-mukavozchyk-ya-starausya-ne-byts-batanikam/)
   Архівавана (https://web.archive.org/web/20201023004007/https://nastgaz.by/andrey-mukavozchyk-ya-starausya-ne-byts-batanikam/) 23 кастрычніка 2020.
3. Андрей МУКОВОЗЧИК: «Умение шутить — дело тренировки» (https://www.tvr.by/company/pressa-o-nas/andrey_mukovozchik_umenie_shutit_delo_trenirovki/)
   Архівавана (https://web.archive.org/web/20210113170826/https://www.tvr.by/company/pressa-o-nas/andrey_mukovozchik_umenie_shutit_delo_trenirovki/) 13 студзеня 2021.
   [Андрэй МУКАВОЗЧЫК: «Уменне жартаваць — гэта справа трэніроўкі»] — Белтэлерадыёкампанія, афіцыйны сайт, 31.03 — 06.04.2003
4. *Вікторыя Целяшук*. Людзей насьмяшыць (https://zviazda.by/be/news/20170330/1490906881-yak-i-chym-zabaulyayuc-gledachou-belaruskiya-telekanaly) // *Звязда* : газета. — 31 сакавіка 2017. — № 61 (29425) (https://zviazda.by/be/number/61-28425). — С. 9 (https://zviazda.by/sites/default/files/31sak-9.indd__0.pdf). — ISSN 1990-763x (http://www.sigla.ru/table.jsp?f=8&t=3&v0=1990-763x&f=1003&t=1&v1=&f=4&t=2&v2=&f=21&t=3&v3=&f=1016&t=3&v4=&f=1016&t=3&v5=&bf=4&b=&d=0&ys=&ye=&lng=&ft=&mt=&dt=&vol=&pt=&iss=&ps=&pe=&tr=&tro=&cc=UNION&i=1&v=tagged&s=0&ss=0&st=0&i18n=ru&rlf=&psz=20&bs=20&ce=hJfuypee8JzzufeGmImYYIpZKRJeeOeeWGJIZRrRRdmtdeee88NJJJJpeeefTJ3peKJJ3UWWPtzzzzzzzzzzzzzzzzzbzzvzzpy5zzjzzzzzzzzzzzzzzzzz

Палітычны крызіс у Беларусі (з 2020 года) [паказаць]

Узята з "https://be.wikipedia.org/w/index.php?title=Андрэй_Мікалаевіч_Мукавозчык&oldid=4477173"